НАВАГОДНЯЯ НОЧ У РАДЗІЛЬНІ 3

КАЛЯНДАР НА 2020 ГОД 15

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 СТУДЗЕНЯ 2020 г. ПЯТНІЦА № 1 (29115)

ЦЫТАТА ДНЯ

Кірыл КАРАЦЕЕЎ, першы намеснік генеральнага дырэктара Кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка «Вялікі камень»:

«Усяго з пачатку рэалізацыі праекта «Вялікі камень» да снежня 2019 года ў яго інвеставана 526,4 мільёна долараў. Доля бюджэтных расходаў склала 4,5 %, або 24,5 мільёна долараў. Гэтыя сродкі пайшлі на будаўніцтва аўтадарогі агульнага карыстання, пажарнага дэпо, сеткі сувязі і газазабеспячэння да меж парка. Пры гэтым бюджэтныя паступленні ад дзейнасці ў парку (з улікам падрадных арганізацый) склалі больш за 40 мільёнаў долараў. На 1 рубель бюджэтных укладанняў у інфраструктуру парка сёння прыпадае 20 рублёў асвоеных інвестыцый і 50 рублёў планаваных да інвеставання».

ЧАС ДАЛЕЙШАГА СТАНАЎЛЕННЯ І ЎМАЦАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ

Фота БелТА.

Навагодні зварот Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі да беларускага народа

Дарагія суайчыннікі!

Адыходзячы 2019-ы павольна, але ўпэўнена пераходзіць у год 2020-ы. І ўсё, што было ў ім: яркія незабыўныя падзеі, найлепшыя пачынанні і мары, нерэалізаваныя планы, — знойдзе свой працяг ужо літаральна заўтра.

У гэтым паслядоўным руху залог стабільнасці і працвітання нашай маладой незалежнай дзяржавы.

Адыходзячы год прайшоў пад знакам 75-годдзя вызвалення Беларусі — падзеі, якая сімвалізуе жыццё і свабоду нашага народа. А ў надыходзячым — мы будзем адзначаць 75 гадоў Вялікай Перамогі, перамогі вялікага савецкага народа над нацызмам.

Мы яшчэ знаходзімся пад уражаннем ад яркіх спартыўных перамог Другіх Еўрапейскіх гульняў, а ўжо заўтра будзем з замiраннем сэрца сачыць за выступленнямі нашых атлетаў на алімпійскіх арэнах у Токіа.

Другі год, прысвечаны малой радзіме, плаўна пяройдзе ў трэці, падагульняючы год трылогіі. Зроблена нямала, але і шмат яшчэ трэба зрабіць.

Для мільёнаў гараджан, непарыўна звязаных з зямлёй свайх продкаў, 2020-ы стане годам ісціны. Кожны павінен знайсці дарогу да сваёй малой радзімы, якая натхняе і дае сілы.

Нядаўна праведзеныя парламенцкія выбары зменіць прэзідэнцкая кампанія, якая стане яшчэ больш насычанай і яркай у палітычным жыцці краіны. Разам нам трэба будзе вызначыць свой лёс і будучыню нашай суверэннай Беларусі.

Надыходзячы год стане юбілейным, дваццатым новага, трэцяга тысячагоддзя. Сустракаючы яго, мы выразна ўсведамляем, як імкліва бяжыць час: зусім нядаўна мы радаваліся, што сталі сведкамі мілення, і не заўважылі, што прайшло ўжо цэлых 20 гадоў.

Вынікам гэтага актыўнага стваральнага перыяду стала пабудова незалежнай, суверэннай дзяржавы. Мы гэта стварылі ўпершыню ў гісторыі. У гісторыі беларускага народа, якому не раз даводзілася змагацца за права «людзьмі звацца». І 2020-ы не будзе выключэннем.

Так, гэта будзе год цяжкай працы і выпрабаванняў, перамог і засмучэнняў. Усё, як у звычайным жыцці. Але як інакш? Права самастойна выбудоўваць свой лёс лёгка не даецца.

І гэта паказаў адыходзячы год. Ён быў складаным для вяскоўцаў, якім давялося пераадолець папярэднія неўраджайныя гады. І яны справіліся, не падвялі.

Самае нагляднае сведчанне таго — нашы традыцыйна хлебасольныя навагоднія сталы.

Наша прамысловасць зрабіла крок наперад. Атрымалі сваё далейшае развіццё транспарт, сувязь, энергетыка, навука і многія іншыя важныя галіны народнай гаспадаркі.

Мы можам па праве ганарыцца поспехамі айчыннай школы медыцыны і адукацыі, культурнымі і спартыўнымі дасягненнямі.

І, вядома, дзякуй людзям у пагонах за мір і спакой на нашай зямлі.

У адыходзячым годзе нашы пазіцыі сур'ёзна ўмацаваліся і на міжнароднай арэне. А заўтра Беларусь возьме на сябе цяжар лідарства ў эканамічным і абаронным саюзах.

Словам, будучы год стане для ўсіх нас часам далейшага станаўлення і ўмацавання беларускай нацыі, захавання асноўных рыс ідэнтычнасці і характару беларусаў. Таго, што адрозніває нас ад іншых, — гасціннасць, міралюбнасць, добразычлівасць, спагадлівасць.

Дарагія сябры! Гэтыя дні — унікальны час: ад Раства каталіцкага да Раства праваслаўнага, калі мы, хрысціяне, прытрымліваючыся найлепшых традыцый і запаведзяў, запрашаем на святы духоўнасці прадстаўнікоў усіх канфесій.

Гэта час доўгачаканых зімовых канікулаў і здзяйснення самых запаветных жаданняў, час, які з асаблівым хваляваннем і надзеяй чакаюць нашы дзеці.

Да Новага года засталіся літаральна секунды. Гэты міг сапраўды дае нам магчымасць адчуць сябе часткай адной вялікай сям'і.

Усвядоміць, што ўсе мы, беларусы, з'яўляемся людзьмі аднаго лёсу. Лёсу, які ствараем сваімі рукамі, абапіраючыся на духоўныя каштоўнасці сваіх продкаў, прадаўжаючы традыцыі свайго народа, працуючы на карысць сваёй Айчыны.

Дарагія беларусы! Паважаныя госці нашай краіны! Няхай 2020-ы стане годам поспехаў і дасягненняў, здзяйснення жаданняў і ажыццяўлення амбіцыйных планаў у імя міру і працвітання нашай краіны! Няхай у вашых сем'ях заўсёды пануюць любоў, шчасце і дабрабыт.

З Новым годам!

КАРОТКА

- Абмяняць старыя грошы з 1 студзеня можна толькі ў Нацбанку.
- **Пункт спрошчанага пропуску «Відзы» на мяжы Літвы і Беларусі стане міжнародным.**
- Банк ствалавых клетак пацыентаў з рэдкімі генетычнымі захворваннямі могуць стварыць у Беларусі.
- **Візіт дзяржсакратара ЗША Майкла Пампеа ў Беларусь адкладаецца ў сувязі з сітуацыяй з пасольствам ЗША ў Іраку.**
- Сяргей Кавальчук узначаліў брэсцкае «Дынама». У якасці гульца Кавальчук абараняў колеры брэсцкага клуба з 1996 да 2004 года.

ISSN 1990 - 763X

ПА ГАЗЕ ДАМОВІЛІСЯ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў апошнія дні адыходзячага года правёў шэраг тэлефонных перагавораў з расійскім бокам наконт пастаўкі вуглевадародаў і нараду з кіраўніцтвам нафтахімічнага комплексу Беларусі.

30 снежня ўвечары адбылася першая тэлефонная размова з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Пуціным. Як паведамляе прэс-служба кіраўніка беларускай дзяржавы, у першай частцы гутаркі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмяняліся цёплымі віншаваннямі з нагоды надыходзячага Новага года, пажадалі ўзаемнага росквіту брацкім народам дзвюх краін.

Другая частка размовы доўжылася больш за гадзіну і была прысвечана ўзгадненню канкрэтных аб'ёмаў, тэрмінаў і цэн на пастаўкі вуглевадародаў і іншых відаў сыравіны. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі таксама нявырашаныя пытанні інтэграцыі, якія знаходзяцца на парадку дня.

У выніку прэзідэнты дамовіліся даручыць урадам у найбліжэйшыя дні арганізаваць работу суб'ектаў гаспадарання з выхадам на заключэнне кантрактаў па нафце і газе. У выпадку калі да 1 студзеня згаданыя пытанні вырашыць не паспеюць, паводле дамоўленасцяў кіраўнікоў дзяржаў, члены ўрадаў выпрацуюць кампрамісны прамежкавы варыянт умоў паставак нафты і газу ў Беларусь да канчатковага прыняцця такіх рашэнняў прэзідэнтамі. Якія, у сваю чаргу, пры неабходнасці сустрэнуцца для абмеркавання і прыняцця такіх рашэнняў пасля калядных свят у сярэдзіне студзеня.

31 снежня па ініцыятыве расійскага боку прэзідэнты працягнулі абмеркаванне па тэлефоне пытанняў, якія датычацца паставак вуглевадародаў, пры гэтым асаблівая ўвага была звернутая на пастаўкі расійскай нафты ў Беларусь.

У той жа дзень Аляксандр Лукашэнка правёў тэлефонную размову з прэм'ер-міністрам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым. Бакі абмяняліся віншаваннямі і цёплымі пажаданнямі ў сувязі з надыходзячым Новым годам. Прэм'ер-міністр Расіі перадаў самыя цёплыя віншаванні з надыходзячым Новым годам і ўсяму беларускаму народу.

Рабочыя пытанні былі абмеркаваны ў працяг перагавораў з Уладзімірам Пуціным, а таксама ў сувязі з тым, што кантрактаў, якія рэгламентуюць работу ў нафтагазавай сферы, на 1 студзеня не заключана. Вынікам размовы стала дамоўленасць аб арганізацыі канкрэтнай работы па пастаўках вуглевадародаў сыравіны ў Беларусь.

Гэтыя ж пытанні Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў па тэлефоне з міністрам энергетыкі Расіі Аляксандрам Новакам. Гаворка ішла пра канкрэтныя графікі і кампаніі, якія будуць пастаўляць нафту ў Беларусь.

Адразу пасля гэтага Прэзідэнт Беларусі правёў нараду з кіраўніцтвам нафтахімічнага комплексу. Па выніках нарады старшыня канцэрна «Белнафтахім» Андрэй Рыбакоў паведаміў, што Аляксандр Лукашэнка даручыў у найбліжэйшыя гадзіны завяршыць перагаворы гаспадарчых суб'ектаў Беларусі і Расіі і заключыць кантракты на пастаўку нафты ў краіну з мэтай забеспячэння бесперабойнай работы двух нафтаперапрацоўчых заводаў.

Таксама кіраўнік дзяржавы даручыў забяспечыць ужо ў найбліжэйшыя дні пастаўку нафты з альтэрнатыўных крыніц. Перш за ўсё размова ідзе аб пастаўках чыгуначным транспартам з партоў на Балтыцы, а таксама аб задзейнічанні для альтэрнатыўных паставак нафтаправода «Дружба».

А дзясятай гадзіне ўвечары апошняга дня года на сайце расійскай кампаніі «Газпрам» з'явілася паведамленне аб тым, што кантракты на пастаўку газу ў Беларусь і транзіт праз тэрыторыю краіны працягнутыя да 2021 года.

Старшыня праўлення кампаніі Аляксандр Мілер і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі Уладзімір Сямашка падпісалі Пратакол паміж «Газпрамам» і ўрадам Беларусі аб парадку фарміравання цаны пры пастаўцы прыроднага газу ў Беларусь у студзені і лютым 2020 года.

«Газпрам» і «Газпрам трансгаз Беларусь» падпісалі дадатковае пагадненне аб прадаўжэнні да 2021 года тэрміну дзеяння кантракту на пастаўку газу ў Беларусь і яго транспарціроўку праз тэрыторыю краіны. Згодна з падпісанымі дакументамі, кантрактныя аб'ёмы паставак і транзіту ў 2020 годзе захаваныя на ўзроўні 2019 года.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Ветэраны атрымаюць матдапамогу да 75-годдзя Перамогі

Ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і некаторым іншым беларусам у сувязі са святкаваннем 75-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў 2020 годзе выплацяць аднаразовую матэрыяльную дапамогу. Адпаведны Указ № 491 «Аб аказанні аднаразовай матэрыяльнай дапамогі» быў падпісаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 30 снежня 2019 года.

У адпаведнасці з указам аднаразовая матэрыяльная дапамога будзе аказана ў памеры:

2500 рублёў — Героям Савецкага Саюза;

1700 рублёў — інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, асобам, якія прымалі ўдзел у баявых дзеяннях па абароне Айчыны да 3 верасня 1945 года; а таксама асобам, якія прымалі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах;

900 рублёў — наступным ветэранам вайны:

— узнагароджаным ордэнамі або медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

— асобам, якія працавалі на аб'ектах супрацьпаветранай абароны, мясцовай супрацьпаветранай абароны, на будаўніцтве абарончых збудаванняў, марскіх баз, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектаў у межах тылавых граніц дзеючых франтоў, на прыфрантавых участках чыгунак і аўтамабільных дарог;

— тым, хто працаваў на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях Ленінграда ў перыяд блакады з 8 верасня 1941 года да 27 студзеня 1944 года і ўзнагароджаны медалём «За абарону Ленінграда», узнагароджаным знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда»;

700 рублёў — грамадзянам, якія пацярпелі ад наступстваў вайны:

— членам сем'яў ваеннаслужачых, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі (памерлі), зніклых без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны (мужу і жонцы, што не ўзялі новы шлюб; дзецям — інвалідам з дзяцінства, у тым ліку ўсыноўленым; іншым утрыманцам), якім устаноўлена павышэнне пенсіі па ўказаных падставах у адпаведнасці з заканадаўствам;

— былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны, якім устаноўлена павышэнне пенсіі па ўказанай падставе ў адпаведнасці з заканадаўствам;

— інвалідам з дзяцінства з прычыны раненння, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з наступствамі ваенных дзеянняў.

* * *

Пры наяўнасці права на аказанне аднаразовай матэрыяльнай дапамогі па некалькіх падставах дапамога будзе аказана па падставе, што прадугледжвае найбольшую выплату.

Выплата аднаразовай матэрыяльнай дапамогі будзе праводзіцца з 1 красавіка да 1 мая 2020 года ў парадку, устаноўленым для выплаты пенсій. Плануецца, што атрымальнікамі такой дапамогі стануць каля 20 тысяч чалавек.

Святлана БУСЬКО.

Па палічках

ШТО ЗМЯНЯЕЦЦА Ў НАШЫМ ЖЫЦЦІ З 1 СТУДЗЕНЯ?

Новы год заўсёды прыносіць з сабой перамены — яны адбываюцца як у жыцці асобнага чалавека, так і цэлай краіны. Мы вырашылі коратка расказаць пра нованаўвядзенні, якія могуць закрануць практычна кожнага беларуса.

Вырасце базавая велічыня

З 1 студзеня 2020 года зменіцца базавая велічыня — з 25,5 рубля яна паднімецца да 27 рублёў. Адпаведна, вырастуць памеры дапамог, стыпендый, а таксама пошлін, зборaў і штрафаў, якія прывязаныя да базавай.

Павысіцца «мінімалка»

З 1 студзеня мінімальная зарплата ў нашай краіне складзе 375 рублёў. У 2019 годзе яна раўнялася 330 рублям. Мінімальная заработная плата — гэта самы нізкі дапушчальны парог аплаты працы ў краіне для ўсіх сфер дзейнасці. Менш плаціць работніку, калі ён працуе на поўную стаўку, па законе проста нельга.

Вырастуць тарыфы на некаторыя ЖКП

Планава павялічваюцца тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі. Праўда, ёсць адно але. Іх рост не павінен перавысіць 5 долараў у эквіваленце ў разліку для тыпавой «двушкі», дзе пражываюць тры чалавекі. Адпаведны ўказ падпісаў Прэзідэнт. Тарыфы будуць павышацца ў два этапы. З 1 студзеня (сумарна на $3,5) павялічацца тарыфы на паслугі газа-, электра- і водазабеспячэння, водаадвядзення, па капітальным рамонце, абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі, санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў жылога дома, памеры кампенсацыі расходаў на электраэнергію. З 1 ліпеня, пасля заканчэння ацяпляльнага сезона, павялічыцца тарыф на паслугі цеплазабеспячэння для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння (на $1,5). Тарыфы на тэхнічнае абслугоўванне жылых дамоў і запорна-перагаворных прылад захоўваюцца на ўзроўні 2019 года.

Павялічыцца пенсійны ўзрост

У 2020 годзе на 6 месяцаў павялічыцца ўзрост выхаду на пенсію і мінімальны страхавы стаж, неабходны для атрымання працоўнай пенсіі. Пенсійны ўзрост для мужчын складзе 62 гады, для жанчын — 57 гадоў. Мінімальны страхавы стаж складзе 17,5 года.

Уступіць у сілу новы Працоўны кодэкс

У 2020 годзе ўступяць у сілу змяненні ў Працоўны кодэкс. У прыватнасці, у нас з'явіцца магчымасць падчас адпачынку працаваць па сумяшчальніцтве поўны рабочы дзень або змену, з добрасумленнымі работнікамі будуць заключаць доўгатэрміновыя кантракты, а пры звальненні з-за няпоўнага рабочага

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

часу будзе павялічана выхадная дапамога. Таксама пры нараджэнні ў сям'і дзіцяці бацька па жаданні зможа ўзяць адпачынак да 14 дзён.

Пачне дзейнічаць абноўлены Жыллёвы кодэкс

У прыватнасці, для тых, хто мае патрэбу ў жыллі, удакладнілі, якія плошчы ў памяшканні ўключаюцца ў агульную жылплошчу, ад якой залежыць, ці патрэбна паляпшэнне жыллёвых умоў. Раней гэта былі жылая плошча і плошчы астатніх памяшканняў, акрамя лоджыі ці балкона. З гэтага года таксама не будуць улічвацца тэрасы і халодныя памяшканні, якія не ацяпляюцца.

Яшчэ адно нованаўвядзенне — з 1 студзеня за тэхабслугоўванне ліфта, прыбіранне пад'езда і электрычнасць на асвятленне і работу абсталявання ў дапаможных памяшканнях плаціць трэба будзе выходзячы з агульнай плошчы кватэры, а не з колькасці зарэгістраваных у кватэры чалавек. А сацыяльна неабароненыя катэгорыі людзей, якія жывуць у арэндным памяшканні, але маюць права на сацыяльнае жыллё, змогуць перавесці арэнднае жыллё ў сацыяльнае і не плаціць за пражыванне ў ім.

Праграма сямейнага капіталу падоўжана

Аднаразовую дзяржпадтрымку пры нараджэнні, усынаўленні / удачарэнні трэцяга або наступных дзяцей у форме сямейнага капіталу працягнулі да 31 снежня 2024 года. Акрамя таго, сямейны капітал пачынаючы з 2020 года будуць прызначаць у рублях (базавы памер — 22,5 тыс. рублёў). Гэтую суму будуць штогод індэксаваць у залежнасці ад тэмпаў інфляцыі. Дарэчы, сямейны капітал цяпер можна будзе датэрмінова выкарыстаць на паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне адукацыі, платныя медпаслугі і фарміраванне назапашвальнай пенсіі для маці.

Вяскоўцы змогуць зняць зарплату з карткі ў краме

З 1 студзеня ў касах некаторых сельскіх магазінаў з'явіцца магчымасць абнаяўіць зарплату. За адзін раз можна будзе зняць да 10 базавых велічынь (гэта значыць да 270 рублёў). Для гэтага неабходна будзе хоць бы адзін раз разлічыцца за тавар сваёй карткай.

Правозіць бытавую тэхніку праз мытню стане танней

З 1 студзеня пры ўвозе тавару на тэрыторыю ЕАЭС паняцце «непадзельны тавар» не будзе прымяняцца. Пры ўвозе ў Беларусь буйной бытавой тэхнікі можна будзе сэканоміць на мытных плацяжах.

Акрамя таго, у нашых краінах з гэтай даты знізяць ліміты бяспошліннага ўвозу тавараў у міжнародных паштовых адпраўленнях да 200 еўра і 31 кілаграма у месяц. Гэта прадугледжана рашэннем ЕЭК па паэтапным скарачэнні нормаў. Пры гэтым ужо цяпер у два разы скароціцца мытная пошліна за перавагу пасылак.

Святлана БУСЬКО, Сяргей КУРКАЧ.

Навагодні рэпартаж

У ЧАКАННІ... ПЕРШАГА ЖЫЦЦЯ

Карэспандэнт «Звязды» сустрэў Новы год у раддоме

Святочна афармлены радзільны дом.

Дзесьці каля апоўначы дождж на вуліцы скончыўся і раптам пахалодала. А літаральна пад тэлетрансляцыю бою курантаў на свет з'явілася дзяўчынка па прозвішчы... Мароз!

У НАС НЕ ГОРШ

Спачатку трохі пра гісторыю, без якой, вядома, няма будучыні. Віцебскі абласны клінічны радзільны дом (раддом № 1) быў праведзены з камплектацыяй найноўшым высокатэхналагічным абсталяваннем і перааснашчэннем для ўкаранення сучасных метадаў аператыўнага ўмяшання і лячэння. З'явілася магчымасць якаснай лабараторнай дыягностыкі.

Каб не стамляць чытачоў тэхнічнымі нюансамі, адзначу, што нараджаюць нашы жанчыны ва ўмовах, не горшых, чым у краінах Еўропы. І штогод, дарэчы, усё больш

Акушэр-гінеколаг Ірына ЖАЎНІЦКАЯ — малады спецыяліст, акушэр-гінеколаг Таццяна ВАКАР і Мар'яна МАРОЗ.

раджанам ён больш вядомы як раддом № 1 на праспекце Чарняхоўскага) амаль што равеснік нашай «Звязды». Газету, нагадаю, пачалі друкаваць у 1917-м. А ў Віцебску першы радзільны дом на сорак ложкаў быў арганізаваны ў 1921-м на базе павятовай бальніцы. І тут працавалі ўсяго тры ўрачы, шэсць акушэрак і чатырнаццаць сядзелак... Віцебск вызвалілі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у чэрвені 1944-га, а ўжо ў верасні ў амаль што цалкам разбураным горадзе радзільны дом аднавіў работу. У яго складзе былі і жаночая кансультацыя, і стацыянар на 45 ложкаў...

Летам 2008-га пасля капітальнага рамонту радзільны дом літаральна распачаў новае жыццё. Рэканструкцыя была праведзена з камплектацыяй найноўшым высокатэхналагічным абсталяваннем і перааснашчэннем для ўкаранення сучасных метадаў аператыўнага ўмяшання і лячэння. З'явілася магчымасць якаснай лабараторнай дыягностыкі.

Каб не стамляць чытачоў тэхнічнымі нюансамі, адзначу, што нараджаюць нашы жанчыны ва ўмовах, не горшых, чым у краінах Еўропы. І штогод, дарэчы, усё больш іншаземак, ахвотных плаціць за магчымасць нарадзіць менавіта ў Віцебску.

НАВАГОДНІЯ КАЗУСЫ

Цікава, што гэты навагодні начны рэпартаж мог сарвацца. Раніцай 31-га віншаваць мам прыходзіў начальнік Галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Віцебскага аблвыканкама, сенатар Юрый Дзеркач, а з ім — і прадстаўнікі шэрагу СМІ. Напэўна, кіраўніцтва раддома думала, што карэспандэнт «Звязды» прыбудзе разам з усімі. Але ж у мае планы ўваходзіла знаёмства менавіта з «навагоднімі» парадзіхамі і «начнымі» немаўлятамі.

Дзякуй богу, арганізацыйнае пытанне ў адміністрацыі радзільнага дома вырашылі вельмі аператыўна. І паабяцалі, што дазволяць падзжурыць з медыкамі ў навагоднюю ноч. Так і адбылося.

Аб адзінаццатай гадзіне ночы я ўжо чакаў на прыпынку трамвая № 1. Да дзвярэй трамвая мяне праводзіў... сімпатычны чорны кот. (Адкуль толькі ўзяўся?) Міжвольна ўспомніў булгакаўскага ката, які не толькі праехаўся ў вагоне, але і спрабаваў заплаціць кандуктару. Мой «праважаты» плаціць, зразумела, не збіраўся. Але, пагадзіцеся, сустрэць коціка напярэдадні надыходу года Пацука — у гэтым ёсць нешта сімвалічнае...

Словам, настрой у мяне быў цудоўны. Натхняў і «звычайны цуд» — нараджэнне новага чалавека, а можа, і некалькіх — сведкам чаго я павінен быў стаць.

«ХУТЧЭЙ, НАРАДЖАЕ!»

А дванаццатай ночы быў каля прыёмнага пакоя.

Супрацоўніца, якая сустрэла пры ўваходзе, папрасіла хутчэй зняць куртку і нацягнуць бахілы. З непрывычкі гэта не атрымалася зрабіць адразу. Як і надзець белы халат. Тлумачылася спешка тым, што жанчыну ўжо павезлі раджаць, а я ж хацеў паспець яшчэ і здымкі зрабіць.

У ардынатарскай пазнаёміўся з маім «гідам» па ўстанове (праўда, хадзілі мы ў межах паверха ад ардынатарскай да залы, дзе нараджаюць). Ім стала прывабная акушэр-гінеколаг Ірына Жаўніцкая. Гэта яе другая навагодняя ноч, калі выпадае дзяжурыць. А вось Таццяна Вакар, маладая акушэр-гінеколаг, працуе першы год. Першы раз у навагоднюю ноч дзяжурыла і педыятр Крысціна Сцяпанава.

НУ, ПРЫВІТАННЕ!

Усяго летась у гэтай установе з'явілася на свет больш за 1600 дзяцей. 31 снежня ўжо мінулага года да гадзіны дня нарадзіліся хлопчык і дзве дзяўчынкі. А хто ж народзіцца першы ў 2020 годзе?

Пакуль весяліў у калідоры прадстаўніц медыцынскага персаналу, пачуў плясканне ў далоні. Аказваецца, калі ў немаўляці ўсё добра, на «апладысменты» яно адрэагуе плачам...

Такім чынам, першай у 2020-м у 00 гадзін 01 хвіліну нарадзілася дзяўчынка. Бацькі вырашылі даць ёй імя Мар'яна. Вага Мар'яны — 2860 грамаў, рост 49 сантыметраў. Мама — 25-гадовая жыхарка Віцебска Настасся Мароз — да выхаду ў дэкрэтны водпуск працавала ў адной з гаспадарак Лёзненскага раёна. Па спецыяльнасці яна ветэрынар. Гэта яе першыя роды, але (дай, неба!) будуць і яшчэ. Наваспечаны бацька даведаўся пра добрую навіну, патэлефанаваўшы ў прыёмны пакой.

З дазволу мамы мы зрабілі першую фотасесію новага чалавечка. Падумаў, што я ж першы мужчына, які «сустрэўся» дзяўчынцы на жыццёвым шляху. З барадой ды вясёлы, напэўна, падобны на Дзеда Мароза. Вырасце — будзе чакаць яго прыходу...

Цікава, кім яна стане, мая новая знаёмая Мар'яна? Можа, таксама журналістам? Тады, калі атрымаецца, пастараюся перадаць ёй здымкі, якія не надрукуюць у газеце. А пакуль што...

Хай расце здаровенькая на радасць бацькам і краіне.

Між іншым, кажуць «нарадзіўся пад шчаслівай зоркай»! Дзяўчынка нарадзілася побач з прадстаўніком «Звязды». Дык будзь, Мар'янка, і доўгажыхаркай, як «Звязда»!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара.

ТАЛОН КІРОЎЦУ БОЛЬШ НЕ ПАТРЭБНЫ

Прэзідэнт падпісаў Указ № 492, якім комплексна карэктуецца пералік адміністрацыйных працэдур, што ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заяве грамадзян. Пра гэта паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Указам адмяняецца неабходнасць афармлення талона да пасведчання кіроўцы і сертыфіката аб праходжанні дзяржаўнага тэхагляду транспартных сродкаў, рэгламентуецца працэдура выдачы міжнароднага пасведчання кіроўцы.

Скарачаюцца тэрміны выканання працэдур, звязаных з пастаноўкай на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а таксама вызначаецца бестэрміновы час дзеяння рашэння аб прызнанні жылога памяшкання неадпаведным устаноўленым санітарным і тэхнічным патрабаванням (цяпер ён складае шэсць месяцаў).

Указ спрашчае парадак пастаноўкі грамадзян на консульскі ўлік, прадугледжваецца адмова ад спагнання платы за рэгістрацыю іншаземцаў, якія часова знаходзяцца ў Беларусі, у выпадку звароту па такую рэгістрацыю цераз адзіны партал электронных паслуг.

Замацоўваецца правамернасць прадстаўлення копіі пашпарта замест арыгінала пры звароце ў падатковыя органы дзеля ажыццяўлення шэрагу адміністрацыйных працэдур. Гэта дасць магчымасць грамадзянам падаваць заявы ў электронным і пісьмовым выглядзе без асабістага наведвання падатковых органаў.

У мэтах захавання тайны ўсынаўлення замест копіі рашэння суда аб усынаўленні можна будзе прадставіць выпіску з такога дакумента.

Акрамя таго, уводзяцца новыя адміністрацыйныя працэдуры, неабходныя для рэалізацыі грамадзянамі сваіх правоў, выключаюцца працэдуры, што страцілі сваю актуальнасць — напрыклад, па выдачы рашэнняў аб прыватызацыі жылых памяшканняў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

❍ Блізкая ўлада

Працяг важнай традыцыі

І ў гэтым годзе вертыкаль улады будзе на прамой сувязі з грамадзянамі. Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць у суботу, 4 студзеня, у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме.

На званкі жыхароў краіны з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:

* кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;
* намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
* кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
* намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8 015 273 56 44;
* кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;
* старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;
* старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Анатоль Аляксандравіч СІВАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Падарункі для ўсіх

Напярэдадні Новага года ў Магілёўскай вобласці адбылося некалькі прыемных адкрыццяў.

У Магілёве на базе СДЮШАР № 7 з'явіўся крыты павет-раапорны футбольны манеж. Гэта ўжо чацвёрты па ліку падобны аб'ект у Беларусі. У збудаванні падтрымліваецца мікраклімат, які дазваляе праводзіць трэніроўкі і гульні пры любым надвор'і. Паназіраць за паядынкамі змогуць адначасова 500 аматараў гэтай гульні. Менавіта на столькі месцаў разлічана глядацкая зона. Унікальнае спартыўнае збудаванне было ўзведзена ў максімальна сціслыя тэрміны — з верасня да снежня.

— Гэта вельмі добрая база для развіцця беларускага футбола, — адзначыў падчас адкрыцця **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.** — Тут нашы футбалісты будуць адточваць сваё майстэрства. Хацелася б, каб сапраўдныя майстры, сапраўдныя футбалісты з Магілёўскай вобласці змаглі б умацаваць сілы каманды Рэспублікі Беларусь.

Леанід Заяц прыняў удзел у адкрыцці яшчэ аднаго знакавага аб'екта для Магілёўскай вобласці — хірургічнага корпуса Асіповіцкай цэнтральнай раённай бальніцы. У яго будаўніцтва быў укладзены 31 мільён беларускіх рублёў. Новы будынак разлічаны на 60 ложкаў. Тут ёсць чатыры аперацыйныя, аснашчаныя сучасным абсталяваннем, аддзяленне гемадыялізу і кабінет камп'ютарнай тамаграфіі. У адкрыцці аб'екта прыняў удзел намеснік міністра аховы здароўя Беларусі Барыс АНДРАСЮК.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

БЕЗ ЗДАРЭННЯЎ НЕ АБЫШЛОСЯ

МУС і МНС падвялі вынікі Новага года

Па звестках Міністэрства ўнутраных спраў, у ноч на 1 студзеня крымінагенная абстаноўка па краіне заставалася ў цэлым спакойнай. Злачынстваў было зарэгістравана менш, чым звычайна, але не абышлося без здарэнняў і тут.

У Верхнядзвінскім раёне 18-гадовы малады чалавек падчас затрымання міліцыянерамі параніў іх нажом. Адзначыліся і два выпадкі панажоўшчыны — у Крычаве жанчына атакавала сужыцеля, а ў Шклоўскім раёне пенсіянер — сваю жонку. Каталізатарам гэтых двух злачынстваў стала спіртное.

На жаль, на дарогах краіны ціха не было. У Брэсцкім раёне кіроўца наехаў на паўпрычэп, які стаяў на ўзбочыне. Ён загінуў. У Пінску іншы кіроўца збіў насмерць жанчыну, якая пераходзіла дарогу па нерэгулюемым пешаходным пераходзе. Што да Мінска, то ў сталіцы ў ноч з 31 снежня на 1 студзеня былі злоўлены шэсць кіроўцаў, якія кіравалі аўтамабілямі «пад градусам». Яшчэ трое селі за руль без правоў. Яшчэ тры пешаходы былі вымушаны сустрэць Новы год на бальнічным ложку з-за таго, што іх збілі аўтамабілісты. Прычым, як адзначылі ў сталічнай ДАІ, ва ўсіх выпадках пешаходы ішлі праз праезную частку па правілах дарожнага руху — або на зялёнае святло, або па «зебры».

Сапраўдная трагедыя разыгралася ў ноч на 1 студзеня ў вёсцы Ільінка, што месціцца ў Магілёўскім раёне. Там згарэў дом. Паведамленне аб пажары паступіла ў 3.42 ночы. Калі ратавальнікі патушылі полымя, то яны знайшлі целы чатырох чалавек. То былі 80-гадовая гаспадыня дома, яе 55-гадовая дачка і двое мужчын, якія гасцявалі, — ім было па 39 і 40 гадоў. Яшчэ адзін пажар са смяротным зыходам адбыўся ў вёсцы Вялікія Шылавічы Слонімскага раёна. На ім загінуў 38-гадовы гаспадар дома.

У першы ж дзень новага года ад агню ў Беларусі загінулі шэсць чалавек. Раніцай з вёскі Махро Іванаўскага раёна паведамілі пра тое, што гарыць дом. Ратавальнікі даталі целы трох мужчын — 53-гадовага гаспадара дома і двух яго гасцей, аднаму з якіх было 53 гады, а другому — 45. Тры іншыя пажары са смяротнымі зыходамі адбыліся ў Навагрудскім, Капыльскім і Верхнядзвінскім раёнах.

Прычыны ўсіх пажараў высвятляюцца.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Наўздагон

ГРЭБЕНЬ, ГРАМАТА, ТРАНСПАРАНТ...

Арыгінальны культурны праект «12 артэфактаў» у гонар тысячагоддзя зладзілі ў Брэсце

Вось і скончыўся юбілейны для Брэста год. Наш горад адзначыў тысячагоддзе. Можна падводзіць пэўныя вынікі. Вядома, новыя масты, дарогі, тэатр, паркі, скверы, дзіцячыя пляцоўкі, якія з'явіліся падчас падрыхтоўкі, — гэта вельмі добра, усё пералічанае будзе служыць людзям доўгія гады. Але ж і яно некалі стане старым альбо неактуальным. У вяках жа найчасцей застаюцца культурныя набыткі і каштоўнасці.

Рарытэты, якія не забралі

Падзеяй юбілейнага года, несумненна, стала вяртанне ў Брэст арыгінальнага экзэмпляра Бібліі, надрукаванай тут амаль 500 гадоў таму. Яшчэ адным адметным мерапрыемствам святкавання, на мой погляд, можна назваць праект абласнога краязнаўчага музея пад назвай «12 артэфактаў». Кожны месяц на працягу тыдня выстаўляюся для экспанавання адзін музейны прадмет, звязаны з гісторыяй горада. Гэта былі найбольш каштоўныя артэфакты з калекцый археалогіі, дакументаў, адзення і іншыя, якія ўяўляюць сабой вялікую гісторыка-культурную каштоўнасць.

Першым, студзеньскім, экспанатам праекта стаў самшытавы грэбень з азбукай работы невядомага майстра, якім берасцянка ў 1240-м ці ў 1250 годзе расчэсвала валасы. А можа, захоўвала яго як сувенір і вучыла па ім дзетак грамаце. Майстар выразаў на грэбені 13 літар старажытнай славянскай азбукі кірыліцы ад А да Л на абодвух баках. Выходзіць, што гэта сапраўдны буквар, да таго ж адзіны, знойдзены на тэрыторыі цяперашняй Беларусі.

Знайшлі яго пры раскопках на месцы старажытнага Бярэсця. У работе пад кіраўніцтвам прафесара Пятра Лысенкі ў 60—70-х гадах удзельнічалі падлеткі, як цяпер кажуць, у якасці валанцёраў. На грэбень наткнуўся брэсцкі школьнік Віктар Пятручык у 1970 годзе. І цяпер музей і горад маюць экспанат сусветнага значэння. Тое, што ва ўмовах адзінай вялікай дзяржавы рарытэт не забралі ва ўстановы культуры Мінска альбо іншага вялікага горада Саюза — ужо свайго роду цуд, адзначылі на прэзентацыі. Доўгія дзесяцігоддзі з прычыны асаблівай каштоўнасці арыгінал захоўвалі ў аддзеле фондаў абласнога краязнаўчага музея, а ў экспазіцыі выстаўлялі муляж.

Яго каштоўнасць найперш у тым, што грэбень служыць сведчаннем: нашы продкі былі пісьменныя, умелі пісаць і чытаць. Актыўна карысталіся кірыліцай. Знойдзены таксама берасцяныя граматы — помнікі бытавой перапіскі.

— Гэта значыць, што не толькі магнаты, але і звычайныя людзі перыяду старажытнага Бярэсця былі адукаванымі. У той час як у Заходняй Еўропе нават манархі замест подпісу часам ставілі «крыжык» — адзначыў **дырэктар Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея Аляксей МІЦЮКОЎ**.

Дырэктар музея Аляксей МІЦЮКОЎ здымае заслону з першага экспаната — грэбеня-азбукі.

Ніна КІРЫЛАВА паказвае царскі мундзір.

Два каралі — шахматны і Рэчы Паспалітай

Другім артэфактам праекта стала шахматная фігурка канца XII — пачатку XIII стагоддзя. Наведвальнікаў больш за ўсё здзівіла, што касцяны кароль выглядае так, нібы зроблены зусім нядаўна. Ён такі маленькі, што можа схавацца ў далоні, але пры блізкім разглядзе падаецца даволі грозным, бровы ссунутыя, погляд пануры. Яго адзенне і галаўны ўбор упрыгожвае адмысловы арнамент. Спецыялісты называюць гэты выраб узорам высокамастацкай разьбы і апрацоўкі. Фігурка была знойдзена ў 1973 годзе падчас раскопак Бярэсця.

Прэзентацыя касцянога шахматнага каралеўства стала доказам захаванасці і значнасці нашай археалагічнай спадчыны. Нездарма брэсцкі археалагічны музей «Бярэсце» называюць каралём археалагічнай спадчыны Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, другога такога няма. Калі нашым суседзям удаецца знайсці аўтэнтычнае бервяно, яны змяшчаюць знаходку пад шкло, выстаўляюць і ганарацца ёю, у нас жа наведвальнік бачыць цэлыя жылыя кварталы XIII стагоддзя.

Дакумент з подпісам караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

Надзвычай цікавым аказаўся жнівеньскі артэфакт — дакумент з асабістым подпісам караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Гаворка ідзе пра перыяд ВКЛ і Рэчы Паспалітай у нашай гісторыі.

Героем дня стала «Сапраўдная прэзента караля польскага і вялікага князя літоўскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага Пятру Катовічу на пасаду святара ўніяцкай царквы ў вёсцы Чаравачыцы Брэсцкага павета». Дакумент на старапольскай мове з уласнаручным подпісам караля і адбіткам каралеўскай пячаткі быў складзены ў Варшаве 11 лістапада 1782 года Адамам Цецішоўскім — «пісарам вялікім каронным, рэгентам канцылярыі міравой Яго Каралеўскай Вялікасці». Гэта прэзента была свайго роду даравальнай граматай Пятру Катовічу на валоданне і арэнду царквы. Панятоўскі выступаў не толькі як кароль, але і гаспадар Брэсцкай эканоміі, на зямлі якой знаходзілася царква. Як землеўладальнік ён даваў права арэнды, а як кіраўнік дзяржавы рэкамендаваў епіскапу Уладзімірскаму і Брэсцкаму Сімяону назначыць згаданага святара на вакантную пасаду.

Падтрымку ў падрыхтоўцы экспаната аказаў Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.

Рэха Брэсцкага міру

Перыяд Расійскай імперыі прадстаўлены ў праекце мундзірам расійскага імператара Мікалая I, з якім паспрыяў краязнаўчаму музею Суворaўскі музей з Кобрына. На гэтай зямлі часта мянялася ўлада, праносіліся войны і рэвалюцыі. Многія са школьных гадоў ведаюць словазлучэнне «Брэсцкі мір». Сепаратны дагавор паміж Савецкай Расіяй і Цэнтральнымі дзяржавамі быў падпісаны ў Брэсце 3 сакавіка 1918 года і забяспечыў выхад РСФСР з Першай сусветнай вайны. Умовы яго заключэння гісторыкі даўно назвалі драпежніцкімі, і Брэст, паводле той дамовы, адыходзіў пад юрысдыкцыю Германіі. Цяпер шматлікім экскурсантам Брэсцкай крэпасці паказваюць руіны Белага палаца, у якім той дагавор быў падпісаны. Дык вось адным з артэфактаў стала пастанова Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта аб анулляванні Брэст-Літоўскага міру, прынятая 13 лістапада 1918 года. Дакумент за подпісамі Свярдлова, Леніна і Аванесава быў надрукаваны ў друкарні Таварыства Сыціна ў 1918 годзе. Арыгінал дакумента перадалі ў музей у 1957 годзе калегі з Львоўскага гістарычнага музея. А для Брэста гэта памяць пра мінулае горада, якое звязана з падзеямі сусветнай гісторыі.

Сведкі навейшай гісторыі

Экспанаты польскага перыяду XX стагоддзя вельмі не падобныя па змесце і адлюстроўваюць зусім розныя старонкі гісторыі... Перадапошнім артэфактам сталі царкоўныя рызы епіскапа Бостанскага, вікарыя Усходне-Амерыканскай епархіі Мітрафана Зноскі. Айцец Мітрафан нарадзіўся ў Брэст-Літоўску. У гэтым горадзе ён служыў настаяцелем Свята-Мікалаеўскай брацкай царквы ў канцы 30-х — пачатку 40-х гадоў. Пазней адзначыўся ў храмах Польшчы, Германіі, Аўстрыі, Марока, ЗША.

Дачка былога святара перадала бацькавы рызы ў музей. Паводле яе слоў, воляй лёсу ён аказаўся ў Заходнім паўшар'і, але заўсёды памятаў сваю малую радзіму.

У 30-х гадах у Брэсце дзейнічаў падпольны акруговы камітэт кампартыі Заходняй Беларусі. Яго актывісты траплялі пад пераслед польскіх улад, але ўвесь час праводзілі акцыі, якія даказвалі існаванне падпольнага руху. Часта такімі акцыямі станавілася дэманстрацыя транспарантаў. Адзін з іх і паказалі наведвальнікам у якасці артэфакта. Транспарант акругкама выкананы жоўтымі літарамі на чырвоным фоне. За гэтыя сем слоў на беларускай мове можна было атрымаць тэрмін турэмнага зняволення, але транспаранты зноў і зноў з'яўляліся ў гарадах і вёсках вобласці.

Апошняй, 12-й, падзеяй праекта стаў экспанат з перыяду гісторыі незалежнай Беларусі. Гэта ганаровы Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь, прысуджаны Брэсцкай вобласці за дасягненні ў гаспадарчым, эканамічным развіцці і ў сувязі з 70-годдзем з дня ўтварэння. Указ аб узнагароджанні быў падпісаны 3 снежня 2009 года. Праз два гады аблвыканкам перадаў сцяг музею на пастаяннае захоўванне.

У студзені музей правядзе выстаўку ўсіх 12 артэфактаў, як паведаміла **загадчыца навукова-экспазіцыйнага аддзела музея Ніна КІРЫЛАВА**. Ніна Міхайлаўна з'яўляецца аўтарам праекта, у які, несумненна, уклала часцінку сваёй душы. Кожны з прадстаўленых экспанатаў, паводле яе слоў, выбіраўся з розных калекцый, праводзілася вялікая папярэдняя работа па вывучэнні, удакладненні гістарычных фактаў і гісторыі самога экспаната. І кожны з рарытэтаў на паказах аўтар суправаджала найцікавейшай прэзентацыяй.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Сугучча

ГОЛАС КУПАЛЫ ГУЧЫЦЬ ШЫРОКА

У Нацыянальнай бібліятэцы Чувашскай Рэспублікі адбылася прэзентацыя зборніка Янкі Купалы «Санеты» на мовах свету», выдадзенага «Мастацкай літаратурай».

У кнізе сярод іншых тэкстаў на 16 мовах — і пераклад легендарнага купалаўскага цыкла на чувашскую мову. Гэтае пераўвасабленне здзейсніў сапраўдны сябра Беларусі — народны паэт Чувашыі Валерый Тургай. Нельга не заўважыць, што літаратар добра вядомы на постсавецкай прасторы як перакладчык паэзіі А. С. Пушкіна, Т. Р. Шаўчэнкі, Ду Фу, Лі Бо, іншых сусветна вядомых паэтаў.

Валерый Тургай — часты госць у Беларусі, удзельнік Дзён беларускага пісьменства, Міжароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час», традыцыйнай Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. У Беларусі ў апошнія гады з'явілася нямала публікацый чувашскага паэта ў перакладзе на беларускую мову. А сам Валерый Тургай пераклаў і выдаў у Чэбаксарах і невялікую анталогію класічнай і сучаснай беларускай паэзіі. У зборніку «Францыск Скарына на мовах народаў свету», які ўжо мае чатыры выданні, змешчаны пераклад урыўка з прадмовы Ф. Скарыны да «Кнігі Юдзіф» у чувашскім пераўвасабленні таксама Валерыя Тургая.

На вечарыне ў гонар купалаўскіх «Санетаў» у Нацыянальнай бібліятэцы Чувашыі гучалі рознамоўныя прачытанні паэзіі народнага песняра Беларусі. Удзельнікі імпрэзы, віншуючы Валерыя Тургая з бліскучым перакладам, адзначылі, што «Санетамі» Янкі Купалы ўзбагачаецца і чувашская паэзія, і чувашская школа мастацкага перакладу.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

КНІГІ З МІНСКА — БЕЛАРУСАМ ЗАМЕЖЖА

Шэсць бібліятэчак кніг беларускіх выдавецтваў (найперш — на беларускай мове) паступілі ў Расійскую Федэрацыю.

Зборы асветніцкай, адукацыйнай, краіназнаўчай, беларускай мастацкай літаратуры, выдадзенай у дзяржаўных выдавецтвах Рэспублікі Беларусь, патрапяць у Федэральную нацыянальна-культурную аўтаномію «Беларусы Расіі», рэгіянальную грамадска-культурную арганізацыю «Нацыянальна-культурная аўтаномія беларусаў Карэліі», Смаленскую рэгіянальную грамадскую арганізацыю «Беларуская нацыянальна-культурная аўтаномія Смаленскай вобласці», грамадскую арганізацыю «Рэгіянальная нацыянальна-культурная аўтаномія «Беларусы Растоўскай вобласці», мясцовую грамадскую арганізацыю беларусаў горада Казані «Спадчына», лабараторыю гісторыі дыяспар гістарычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава.

Несумненна, гэта паспрыяе большай цікаўнасці да беларускай кнігі і задаволіць патрэбы беларусаў замежжа ў кнігах з Беларусі.

Праект рэалізоўваецца ў межах падпраграмы «Беларусы ў свеце» Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016—2020 гады.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Прыгожае жыццё

На абцасах па карону

У апошнія дні снежня завяршыліся рэгіянальныя кастынгі конкурсу «Міс Беларусь 2020», які ладзяць сумесна тэлеканал АНТ, Міністэрства культуры Беларусі і Нацыянальная школа прыгажосці. Адборы прайшлі ў 126 раёнах краіны, а самым масавым быў адбор у Гомелі, які сабраў рэкордную колькасць прэтэндэнтак, — больш як 100 дзяўчат. Апошнім пунктам у рэгіянальным этапе стала Іўе.

А ўжо 25 студзеня пасля невялікіх зімовых канікул праект працягнецца. Пераможцы раённых этапаў і тыя дзяўчаты, хто з нейкіх прычын не змог паўдзельнічаць у іх, збяруцца ў абласных гарадах, каб прадэманстраваць не толькі прывабную знешнасць, мадэльныя параметры і клясічнае дэфіле, але таксама эрудыцыю і кемлівасць, сцэнічнае майстэрства, спартыўную падрыхтоўку і творчыя здольнасці. Расклад абласных кастынгаў наступны: 25 студзеня — Гомель, 26 студзеня — Магілёў, 1 лютага — Гродна, 2 лютага — Брэст, 8 лютага — Віцебск, 9 лютага — Барысаў (Мінская вобласць), 15 і 16 лютага — Мінск.

Нагадаем, умовы для кандыдатак акрэслены дакладныя і адназначныя: узрост ад 18 да 24 гадоў уключна на дату правядзення фіналу, рост ад 174 сантыметраў, адсутнасць татуіровак і пірсінгу, а ў пашпарце — ніякіх пазнак аб шлюбе або разводзе і дзецях.

Фінал нацыянальнага конкурсу прыгажосці традыцыйна пройдзе ў маі ў Мінску. На ўсіх этапах адбору суддзі прымаюць да ўвагі мноства фактараў, якія дазволяць дзяўчыне прэтэндаваць на тытул першай прыгажуні. А ўзнагароды — не толькі карона пераможцы, грашовы прыз і званне «Міс Беларусь», але і магчымасць прадстаўляць нашу краіну на самых прэстыжных міжнародных конкурсах.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 104

З 14 да 17 снежня ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках праходзіў Кубак Беларусі. Спачатку 17 камандаў спаборнічалі ў шашкі-64. Перамагла каманда БДУ (Уладзіслаў Валюк, Яна Якубовіч, Аляксей Валюк, Аляксандра Спірына). На другім месцы каманда РЦАП, трэцімі фінішавалі шашысты Гродзенскай вобласці. Потым у барацьбу уступілі 13 камандаў сталеватчнікаў. Зноў перамагла каманда БДУ (Уладзіслаў Валюк, Юрый Цімановіч, Яна Якубовіч). На другім месцы каманда БДУФК, трэцімі фінішавалі шашысты Магілёўскай вобласці.

22 снежня ў Мінску (у бібліятэцы па вул. Жукоўскага, 9) адбыўся турнір па шашках-64 сярод ветэранаў, у якім прыняў удзел 21 шашыст. Перамог гросмайстар Аркадзь Плакхін — 16 ачкоў з 18 магчымых. На другім месцы кандыдат у майстры Мар'ян Пякарскі — 15 ачкоў, трэцім фінішаваў майстар Вячаслаў Палянскі — 14 ачкоў.

Паглядзіце некалькі цікавых фрагментаў з практычнай гульні.

№ 1 Г. Кулагін — М. Кадзеснікаў

Белыя простыя шашкі: 42, 43, 36, 37, 38, 32, 33, 35, 27, 28, 30, 22 (12)

Чорныя простыя шашкі: 26, 21, 23, 24, 16, 17, 19, 11, 13, 15, 6, 3 (12)

1.36—31 (На 1.43—39? Была запланавана разгромная камбінацыя, пакажыце яе) далей было

1...24—29 2.33:24 23—29 3.24:33 19—23 4.28:08 17:48 =

№ 2 А. Шавандаў — А. Плакхін

Белыя простыя шашкі: c1, e1, d2, c3, e3, h4, g5, h6 (8)

Чорныя простыя шашкі: a3, a5, e5, b6, d6, e7, f8, h8 (8)

Чорныя згулялі 1...e5-f4 і пасля 2.e3-d4 правялі камбінацыю f4-g3 3.h4xf2 f8-g7 4.h6xf8 d6-c5 5.f8xb4 a3xg1 і неўзабаве партыя скончылася ўнічыю.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

№ 3



Белыя простыя шашкі: g1, h2, e3, f4, g5, a7 (6)

Чорныя простыя шашкі: b2, f2, b4, d4, c5 (5)

№ 4

Белыя простыя шашкі: c1, d2, h2, c3, g3, h4, c5 (7)

